# Як да нас прыйшла кніга

Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь
4 клас

**К. М. Зубар,**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай катэгорыі
СШ № 5 г. Мазыра

**Мэта:** даць вучням першапачатковыя ўяўленні аб паходжанні кніг.

**Задачы:**

• Фарміраваць у вучняў уяўленні аб старажытным паходжанні рукапісных кніг.

• Пазнаеміць з жыццём і творчасцю Кірылы Тураўскага, усведаміць аб маральным сэнсе запавета Кірылы Тураўскага.

• Выхоўваць любоў і павагу, беражлівыя адносіны да кнігі, пачуццё гонару за нашых продкаў, іх майстэрства, за ўсе, што яны зрабілі.

**Абсталяванне:**
падручнік «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», прэзентацыя Power Point, Q-код, планшэт, берасцяная грамата, малюнкі, птушынае пяро, чарніла, драўляныя палачкі, карткі з тэстамі, гістарычныя тэрміны, план урока, атлас, гістарычная карта, контурная карта, план-характарыстыка гістарычнай асобы, крыжаванка.

## Ход урока

| ЗМЕСТ | СЛАЙД |
|---|---|
| ***1. Арганізацыйны момант***<br>• Дзеці, я жадаю вам старанняй працы на ўроку, каб вы былі гатовыя прыйсці на дапамогу таму, каму яна спатрэбіцца, заставаліся стараннымі і дапытлівымі.<br>***2. Праверка дамашняга задання***<br>• Сёння мы працягваем падарожжа ў цікавы свет мінулага, вы атрымаеце новыя веды, даведаецеся, што абазначаюць паняцці на дошцы.<br>Але спачатку давайце ўспомнім, куды вы падарожнічалі на мінулым уроку?<br>Як гучала тэма? (Маўклівыя сведкі мінуўшчыны).<br>Зараз мы выканаем розныя віды тэстаў, каб праверыць дамашнее заданне.<br>Вучні працуюць самастойна:<br>Група 1:<br>Тэст 1 на друкаванай аснове.<br>1. Камяні, у якіх людзі прасілі дапамогі, называлі_____.<br>2. Князя, які загадаў выбіць надпісы на камянях, звалі____.<br>3. Запішыце другую назву Барысава камня ___________.<br>4. Музей валуноў створаны ў _________________.<br>5. Старажытныя пахаванні называюць _______________. | Слайд 1 |

6. Волат – гэта ______________.
7. Запішыце заснавальнікаў беларускай археалогіі _______.
8. Браты Тышкевічы нарадзіліся ў _______________.
9. Браты Тышкевічы стварылі ____________________.
10. Археалогію называюць яшчэ ___________________.

Група 2:

Тэст 2 на планшэце

https://goo.gl/forms/V51tEljZMC8We46i2

Група 3:

Тэст3 на планшэце

Праверка тэста 1.

***3. Падрыхтоўка да працы на асноўным этапе***

Слайд 2

- Яшчэ раз звернемся да камянеў і уважліва паглядзім.

Слайд 3

- Мы бачым розныя надпісы. Як вы лічыце, што гэта? Хто рабіў? Чаму?
- Такія надпісы старажытныя людзі рабілі не толькі на камянях і сценах.

Рубрыка «Паслухаем гісторыка» (падрыхтаваны вучань распавядае пра берасцяныя граматы)

***4. Этап засваення новых ведаў***

Слайд 4

- Вам патрэбна разгадаць загадку:

*Белае поле, чорнае семя.*
*Хто яе сее, той разумее.*

(Кніга)

- Як вы ўжо здагадаліся, сёння на ўроку пойдзе гаворка пра кнігі. Тэма нашага ўрока «Як да нас прыйшла кніга».
- Працаваць на ўроку мы будзем па наступным плане:

ПЛАН
1. Летапісы
2. Рукапісныя кнігі
3. Кірыла Тураўскі

- З даўніх часоў пра жыццё нашых продкаў паведамляюць ЛЕТАПІСЫ.
- А што такое летапіс? Адказ на гэтае пытанне можна знайсці ў слоўніку на с.154.

*Летапіс* – рукапісная кніга, у якой штогод запісваліся звесткі аб гістарычных падзеях.

Рубрыка «Паслухаем гісторыкаў» (драматызацыя, паведамленне манаха Нестара пра летапіс «Аповесць мінулых гадоў»)

- Аднойчы нехта сказаў «…ад іх зыходзіць мудрасць». Як вы лічыце,

| | |
|---|---|
| пра што так казалі старажытныя людзі?<br>• Рубрыка «Паслухаем гісторыкаў» (цікавыя звесткі гісторыкаў пра старажытную кнігу, паведамленне пра «Кнігі на ланцугах»)<br>• Як вы разумееце выраз «Ад дошкі да дошкі» (адказы вучняў)<br>***Фізкультхвілінка***<br>• Уявіце, што вы старажытныя рукапісцы. Каб прыступіць да працы, нам патрэбны чарніла. Гэта сення іх можна купіць, а раней людзі іх рабілі самі. Як? Паслухайце!<br>Патрэбна растаўчы чарнільныя арэшкі, прасеяць. Змяшаць прэсны мёд з вішнёвым. Апусціць у гэтую сумесь жалезныя пласціны. Схаваць у цеплае месца на тры дні, пастаянна памешваць.<br>Праца ў групах (на партах чарніла, гусінае пер'е, лісты, вучні пісьмова выконваюць заданні гусіным пяром ці драўлянай палачкай)<br>**Заданні групам**<br>Група 1:<br>Дапоўніце сказ:<br>____________ – рукапісная кніга, у якой штогод запісваліся звесткі аб гістарычных падзеях.<br>Група 2:<br>Дапоўніце сказ:<br>Самы старажытны летапіс быў напісаны ў ____________.<br>Група 3:<br>Дапоўніце сказ:<br>«Аповесць мінулых гадоў» напісаў манах ____________.<br>***Работа з падручнікам***<br>• А зараз звернемся да падручніка. С.33 (чытаем другі абзац)<br>• Назавіце галоўныя цэнтры перапісвання кніг. (Полацк, Тураў)<br>• Знайдзіце на с.10-11 атласа гарады Полацк і Тураў.<br>• Якія майстэрні знаходзіліся ў гэтых гарадах?<br>• Пакажыце старажытныя гарады на гістарычнай карце.<br>• Самастойна абазначце іх на контурнай карце.<br>• Гістарычныя звесткі пра Кірылу Тураўскага (с.33)<br>• Знаёмства з новымі гістарычнымі тэрмінамі ***манах і вежа*** (слоўнік с.160,159)<br>*Манах* – чалавек, які прысвяціў сваё жыццё служэнню Богу.<br>*Вежа* – высокае абарончае збудаванне з дрэва ці цэглы.<br>Пытанні:<br>1. Калі і дзе нарадзіўся Кірыла Тураўскі?<br>2. Пра што пісаў павучанні?<br>3. Як адносіліся людзі да манаха?<br>4. Як называлі Кірылу Тураўскага? Чаму?<br>• Рубрыка «Паслухаем гісторыкаў» (Павучанні Кірылы Тураўскага)<br>https://www.youtube.com/watch?v=Gkly1pD5AnY<br>Работа у групах.<br>Складзіце партрэт гістарычнай асобы па плане: | Слайд 5<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>Слайд 6,7<br><br><br><br><br>Слайд 8 |

План

1. Дзе нарадзіўся Кірыла Тураўскі?
2. У якім стагоддзі жыў?
3. Кім стаў?
4. Чым займаўся?
5. Чаму вычыў?
6. Якую карысць прыносіў людзям?
7. Што вы лічыце найбольш важнай справай у жыцці Кірылы Тураўскага?

- У 1993 годзе ў горадзе Тураве на Замкавай гары быў адкрыты велічны помнік нашаму выдатнаму продку – Кірылу Тураўскаму. Таксама помнікі ёсць у Мінску і ў Гомелі.

Слайд 9

***6. Этап інфармавання аб дамашнім заданні***

- Дома падрыхтуйце паведамленні пра паходжанне помнікаў Кірылу Тураўскаму.

Слайд 10

***7. Этап замацавання новых ведаў***

Праца ў парах.

- Вызначце адрозненні паміж старадаўняй (рукапіснай) і сучаснай (друкаванай) кнігамі. Для гэтага вам патрэбна правесці стрэлкі ў патрэбных накірунках (Дадатак).

Слайд 11

<table>
<tr><td rowspan="10">СТАРАДАЎНЯЯ КНІГА</td><td>Скура жывёл</td><td rowspan="10">СУЧАСНАЯ КНІГА</td></tr>
<tr><td>Папера</td></tr>
<tr><td>Рукапісная</td></tr>
<tr><td>Друкаваная</td></tr>
<tr><td>Гусінае пяро</td></tr>
<tr><td>Пісала</td></tr>
<tr><td>Драўляныя вокладкі</td></tr>
<tr><td>Засцежкі</td></tr>
<tr><td>Маляваныя пачат-ковыя літары</td></tr>
<tr><td>Друкаваныя пачат-ковыя літары</td></tr>
</table>

***8. Падвядзенне вынікаў урока***

1. Аб чым мы сёння размаўлялі на ўроку?
2. Што ўяўлялі сабой берасцяныя граматы?
3. Пра што расказваюць нам летапісы?
4. Які з іх з’яўляецца самым старажытным?
5. Назавіце гарады, якія былі галоўнымі цэнтрамі перапісвання кніг.
6. Да чаго Кірыла Тураўскі заклікаў людзей?

***9. Рэфлексія***

Я даведаўся …

Я навучыўся…

Я не зразумеў…

Было цяжка…

**Гульня «Крыжаванка »**

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | 1. | **М** | **А** | **Н** | **А** | **Х** |
| | | | | 2. | **Т** | **У** | **Р** | **А** | **Ў** | | | |
| | | | 3. | **К** | **І** | **Р** | **Ы** | **Л** | **А** | | | |
| | | | | 4. | **В** | **Е** | **Ж** | **А** | | | | |
| | | 5. | **С** | **К** | **У** | **Р** | **А** | **Й** | | | | |
| | | | 6. | **П** | **О** | **Л** | **А** | **Ц** | **К** | | | |
| 7. | **Л** | **Е** | **Т** | **А** | **П** | **І** | **С** | **Ы** | | | | |

1. Чалавек, які прысвяціў сваё жыцце служэнню Богу.
2. Дзе нарадзіўся Кірыла Тураўскі?
3. Як звалі хлопчыка, які нарадзіўся ў Тураве ў 12ст.?
4. Высокае абарончае збудаванне.
5. Чым абцягвалі вокладкі кніг?
6. Адзін з галоўных цэнтраў перапісвання кніг.
7. Рукапісная кніга, у якой штогод запісваліся звесткі аб гістарычных падзеях.

**МАЛАЙЦЫ!**

Вы сёння добра працавалі. Каменціраванне і выстаўленне адзнак.

Я дзякую вам за ўрок! Да пабачэння.

Слайд 12 – 19

# Як да нас прыйшла кніга



1. БОЖЫМІ
2. ПОЛАЦКІ КНЯЗЬ БАРЫС
3. БАРЫС – ХЛЕБНІК
4. МІНСК
5. КУРГАНЫ
6. ДУЖЫ ЧАЛАВЕК
7. БРАТЫ ТЫШКЕВІЧЫ
8. 19 СТ.
9. МУЗЕЙ СТАРАЖЫТНАСЦЕЙ
10. НАВУКА З РЫДЛЕЎКАЙ У РУКАХ









**Берасцяныя граматы** — пісьмы, запіскі і дакументы на бяросце, помнікі пісьмовасці XI — XV ст.



# Нестар





Старонка з "Аповесці мінулых гадоў"

**По́лацк** – горад у Віцебскай вобласці Беларусі.

Тапонім **«Полацк»** утварыўся ад імя ракі Палата.



**Ту́раў** – горад ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці Беларусі.

Тапонім **«Тураў»** звязаны з імем варажскага князя Тура.





# Кірыла Тураўскі

**(каля 1130—1182)**



# ПЛАН-ХАРАКТАРЫСТЫКА

1. Дзе нарадзіўся Кірыла Тураўскі?
2. У якім стагоддзі жыў?
3. Кім стаў?
4. Чым займаўся?
5. Чаму вучыў?
6. Якую карысць прыносіў людзям?
7. Што вы лічыце найбольш важнай справай у жыцці Кірылы Тураўскага? Чаму?






КІРЫЛА
ТУРАЎСКІ


1.
2.
3.
4.
5.
6.
7.


1.
М А Н А Х
2.
3.
4.
5.
6.
7.


1. МАНАХ
2. ТУРАЎ
3.
4.
5.
6.
7.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | 1. | М | А | Н | А | Х |
| | | | | 2. | Т | У | Р | А | Ў | | | |
| | | | 3. | К | І | Р | Ы | Л | А | | | |
| | | | | 4. | | | | | | | | |
| | | 5. | | | | | | | | | | |
| | | | 6. | | | | | | | | | |
| 7. | | | | | | | | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | 1. | М | А | Н | А | Х |
| | | | | 2. | Т | У | Р | А | Ў | | | |
| | | | 3. | К | І | Р | Ы | Л | А | | | |
| | | | | 4. | В | Е | Ж | А | | | | |
| | | 5. | | | | | | | | | | |
| | | | 6. | | | | | | | | | |
| 7. | | | | | | | | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | 1. | М | А | Н | А | Х |
| | | | | 2. | Т | У | Р | А | Ў | | | |
| | | | 3. | К | І | Р | Ы | Л | А | | | |
| | | | | 4. | В | Е | Ж | А | | | | |
| | | 5. | С | К | У | Р | А | Й | | | | |
| | | | 6. | | | | | | | | | |
| 7. | | | | | | | | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | 1. | М | А | Н | А | Х |
| | | | | 2. | Т | У | Р | А | Ў | | | |
| | | | 3. | К | І | Р | Ы | Л | А | | | |
| | | | | 4. | В | Е | Ж | А | | | | |
| | | 5. | С | К | У | Р | А | Й | | | | |
| | | | 6. | П | О | Л | А | Ц | К | | | |
| 7. | | | | | | | | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | 1. | М | А | Н | А | Х |
| | | | | 2. | Т | У | Р | А | Ў | | | |
| | | | 3. | К | І | Р | Ы | Л | А | | | |
| | | | | 4. | В | Е | Ж | А | | | | |
| | | 5. | С | К | У | Р | А | Й | | | | |
| | | | 6. | П | О | Л | А | Ц | К | | | |
| 7. | Л | Е | Т | А | П | І | С | Ы | | | | |